Зубчонак, Н. А.
Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,
/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

### 1.3.4. ДРУК ЗЕМСТВАЎ

На мяжы дзвюх рэвалюцый зрабілі спробу арганізаваць сваю прэсу і земствы. У Беларусі мясцовымі земскімі ўстановамі былі падрыхтаваны такія выданні, як «Вестник Минского губернского земства» (1914–1915 гг.); «Вестник Могилевского земства» (1914–1917 гг.); «Могилевская земская неделя» (1910 г.) і іншыя. «Губернские ведомости» мелі спецыяльны аддзел «Земское дело». Пры газеце «Могилевский вестник» у 1907–1908 гг. выходзіў часопіс «Вестник земского хозяйства Могилевской губернии». На тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю земствы здолелі актывізаваць сваю дзейнасць менавіта ў Магілёўскай губерні. З 1907 па 1917 г. там выходзіла чатыры земскія перыядычныя выданні — тры газеты і часопіс.

Земства, па сутнасці сваёй, з’явілася правобразам грамадскай арганізацыі ўнутры самадзяржаўнай формы кіравання, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі маёмасных класаў, у асноўным зямельнага дваранства, якое займалася пытаннямі народнай адукацыі, асветы, вырашала гаспадарчыя праблемы.

Гісторыкі савецкіх часоў адмоўна ацэньвалі дзейнасць інстытута земства і лічылі, што яго спробы стварыць сваю грамадска-палітычную прэсу ва ўмовах самадзяржаўя аказаліся марнымі [49, с. 34], як і ўвогуле само існаванне гэтай сістэмы кіравання ў Расійскай імперыі. «З дапамогай земскіх устаноў урад спадзяваўся ўмацаваць уплыў рускіх памешчыкаў і праваслаўнага духавенства на беларускае і ўкраінскае сялянства, супрацьпаставіць іх палякам і такім чынам распаліць нацыянальную варожасць, каб лягчэй весці барацьбу з нацыянальна-вызваленчым рухам» [20,с. 487]. Указвалася таксама, што земскія выданні па свайму зместу былі даволі слабымі і не змаглі аказаць значнага ўплыву на грамадскую думку свайго часу. Нягледзячы на гэта, земскі друк стаў пачатковай формай выдавецкай дзейнасці грамадскіх арганізацый у Паўночна-Заходнім краі [49, с. 36].

Ліберальных пазіцый у асвятленні праблем грамадскага жыцця прытрымліваліся газеты і часопісы, якія выходзілі звычайна пры гарадскіх і губернскіх земскіх управах. Гэты від выданняў быў распаўсюджаны даволі шырока. Можна нават сцвярджаць, што многія з іх змаглі ў час палітычнай рэакцыі захаваць магчымасць выдавацца, набыць сваіх прыхільнікаў, аб чым сведчаць аддзелы карэспандэнцыі, якія змяшчаліся ў кожнай газеце ці часопісе. Праблемы, якія вырашалі

земскія выданні, даволі разнастайныя. Рэдакцыі займаліся пытаннямі земскага кіравання, аказаннем дапамогі насельніцтву, друкуючы матэрыялы па арганізацыі вядзення сельскай гаспадаркі, садаводства, прыватнага будаўніцтва; разглядалі праблемы асветы, адукацыі насельніцтва, садзейнічалі адкрыццю медыцынскіх устаноў, прыютаў для сірот, займаліся зборам ахвяраванняў на дабрачынныя мэты і г. д. Шмат месца на сваіх старонках земскія выданні адводзілі праблемам асветы народа. Напрыклад, «Могилёвская земская неделя» заклікала настаўнікаў працаваць разам: «І вось, у гэтай справе, неацэнную паслугу земству могуць аказаць настаўнікі, і толькі яны... Няхай толькі настаўнікі як мага шырэй і паўней асвятляюць жыццё земскай ды і ўсялякай іншай школы на старонках “Земской недели”. Няхай газета зробіцца для іх такім месцам, куды яны панясуць усе свае нягоды і сум» [1910, № 1--3].

Змест той інфармацыі, якую даваў земскі друк, мала садзейнічаў працэсу дэмакратычных рэформ, які пачаўся ў краіне з рэвалюцыяй 1905–1907 гг. Рэдакцыі імкнуліся захоўваць нейтральную пазіцыю, адасобіўшыся ад агульнага палітычнага руху канкрэтнымі задачамі. Поле дзейнасці земскіх устаноў было абмежаваным і выданні не спяшаліся пашыраць яго.

Не садзейнічаў земскі друк актывізацыі беларускага дэмакратычнага руху. У асвятленні праблем адукацыі не ўзнімалася пытанне нацыянальнай мовы, якое ў той час было, бадай, самым важным для беларусаў.

Аднак у дзейнасці земскіх выданняў, як і саміх устаноў, прысутнічаюць пазітыўныя рысы. Па-першае, па сваім змесце газеты і часопісы ўсё ж былі больш дэмакратычнымі ў параўнанні з афіцыйнай прэсай. На нашу думку, іх праца ў асноўным была накіравана на тое, каб у межах сваёй дзейнасці дапамагчы народу змяніць умовы жыцця.

Па-другое, інстытут земства ў беларускіх губенях у пачатку XX ст. быў даволі моцным. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца выданні, якія выходзілі ва ўсіх буйных гарадах, спецыялізаваныя аддзелы ў дзяржаўных газетах, што пастаянна друкавалі справаздачы аб дзейнасці устаноў.

У час Першай сусветнай вайны у 1916 г. быў арганізаваны спецыяльны Земскі Саюз фронта. Ён наладзіў у Мінску пры Аддзеле службы сувязі свой орган – «Вестник комитета Западного фронта Всероссийского земского союза». У гэты перыяд такое выданне было адзіным. У 1914–1915 гг. выходзілі «Вестник Могилевского земства», «Вестник Минского губернского земства» і інш. У ваенных умовах земствы займаліся арганізацыяй дапамогі насельніцтву, салдатам. У № 87 «Вестника комитета Западного фронта» паведамлялася, што да першага паўгоддзя 1916 г. на Паўночным фронце дзейнічала 317 земскіх устаноў, на Заходнім – 1043, на Паўднёва-Заходнім – 1631 і на Каўказскім 288. На франтах Земскім саюзам абсталёўваліся шпіталі,

амбулаторыі, ствараліся санітарныя паязды, харчовыя атрады, інфекцыйныя ўстановы, лазні, конныя абозы і г. д.

Трэба звярнуць увагу і на тое, што земскія выданні друкавалі шмат матэрыялаў, прысвечаных эканамічнаму развіццю Беларусі. У кожнай газеце быў спецыяльны аддзел, дзе падрабязна разглядаўся бюджэт краіны, выдаткі на асвету, ахову здароўя і іншыя сферы. У земскіх выданнях змяшчалася інфармацыя аб развіцці розных галін прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю. Кожнае з іх знаёміла чытача з навінамі культуры, літаратуры. Друкаваліся аб’ёмныя матэрыялы па творчасці пісьменнікаў (Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага і інш.). Культурнае жыццё Беларусі прадстаўлена не было, інфармацыя датычылася выключна расійскай рэчаіснасці. Тым не менш, нягледзячы на абмежаванасць, земствы садзейнічалі развіццю мясцовай ініцыятывы, гаспадаркі і культуры.

Аб’ём земскіх выданняў быў даволі вялікі. Штомесячна часопісы выходзілі аб’ёмам да 40–60 старонак («Вестник Минского губернского земства»).

Друкаваныя матэрыялы беларускіх земскіх выданняў не мелі вострай публіцыстычнай накіраванасці, не спрыялі абуджэнню нацыянальнай свядомасці народа, не заклікалі людзей да ўдзелу ў рэвалюцыйна-дэмакратычных пераўтварэннях у краіне. Тым не менш, яны пакінулі значны след у гісторыі беларускага друку, адлюстраваўшы дзейнасць земскіх устаноў, якія працавалі дзеля паляпшэння дабрабыту людзей,хоць і заставаліся пры гэтым прыхільнікамі расійскай самадзяржаўнай палітыкі.

У 1908 г. Галоўным упраўленнем па справах друку была праведзена выстава друкаванай прадукцыі, што выпускалася на тэрыторыі ўсёй Расіі. У статыстычным аддзеле прыводзіліся дадзеныя, якія адлюстроўвалі парадак размеркавання 2028 перыядычных органаў сярод выдаўцоў. Урадавы і земскі друк складаў больш за 12 % ад агульнай колькасці выданняў [49, с. 50].